# Кераміка па-бабруйску

**Выстаўка керамікі «Бабруйскі варыянт» адчынілася для наведвальнікаў у мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». Свае работы прадставілі чацвёра мастакоў-керамістаў з Бабруйска.**

**Дзіяна КАРОЛЬ,**
**фота аўтара**

Асноўнае, што аб'ядноўвае ўдзельнікаў выстаўкі — прадстаўнікоў старэйшага пакалення Валерыя Калтыгіна і Анатоля Концуба і маладзейшых — Алега Ткачова і Максіма Калтыгіна, — прафесійная мастацкая кераміка ці, дакладней, творчае і трапяткое стаўленне да яе. Кераміка ў іх выкананні адметная, у кожнага свой творчы почырк, стыль, твар. Аб'ядноўвае мастакоў і штогадовы міжнародны пленэр па кераміцы «Арт-Жыжаль», што праходзіць у Бабруйску, на якім мастакі працуюць у супольНай творчасці некалькі тыдняў з «жывым» агнём.

Валерый Калтыгін — старшыня Бабруйскага аддзялення Беларускага саюза мастакоў, адзначаны прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў сферы мастацтва, арганізатар і кіраўнік «Арт-Жыжаля». Анатоль Концуб — заслужаны работнік народнай адукацыі Беларусі, удзельнік міжнародных пленэраў па кераміцы і жывапісе. Максім Калтыгін — стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, стыпендыят Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Алег Ткачоў — выпускнік Беларускага Дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, адзначаны прэміяй ААН за работу «Чалавек і чалавецтва».

Паводле ўдзельніка, ідэйнага натхняльніка і куратара выстаўкі Валерыя Калтыгіна, калі параўнаць тэндэнцыі сённяшняй керамікі з керамікай 1970 — 1980-х гг., добра бачны пераход ад дэкаратыўна-прыкладной скіраванасці да дэкаратыўнага, болын станковага напрамку. На яго думку, такі зварот мастакоў да свабоднага погляду на кераміку абумоўлены адсутнасцю заказаў на манументальныя творы.

— У Беларусі мы маем выдатны напрамак у кераміцы, тут працуюць таленавітыя мастакі, у іх творах прысутнічаюць асацыятыўныя выказванні, шмат гратэску, трансфармацый, якія трэба разумець, а значыць, і



*Алег Ткачоў. Каланізацыя. 2010. Шамот. Солі. Палівы.*

размаўляць на адной мове з керамікай, — упэўнены В. Калтыгін. Выказаў ён і сваё меркаванне наконт таго, дзе быць цэнтру керамікі: — Ад таго, што ўжо не адзін год паспяхова праводзіцца міжнародны пленэр «Арт-жыжаль», цэнтр беларускай керамікі не перамесціцца ў Бабруйск — як ні круці, асноўная маса керамістаў жыве ў Мінску. А вось добрай базы ў сталіцы няма, — пашкадаваў мастак.